слабые умения в области проектирования целей урока. Об этом свидетельствуют результаты проведённого нами анализа развёрнутых панов-конспектов студентов к зачётным урокам.

Оценивание конспектов осуществлялось по умению студентами формулировать цель урока, её обучающий, развивающий и воспитательный компоненты.

Результаты оценивания содержания конспектов выглядели следующим образом:

- «пять» балов – 2 конспекта (5,9%), высокий уровень, цель, её компоненты соответствуют содержанию урока;

- «четыре» бала – 8 конспектов (23,5%), средний уровень, цель, её компоненты в основном соответствуют содержанию урока, однако они не чётко сформулированы и не все компоненты прослеживаются в структуре планируемого урока;

- «три» бала – 16 конспектов (47%), ниже среднего уровня, компоненты цели носят общий, декларативный характер, просматривается путаница в их определении. Беседа по теме урока и объяснение нового материала не согласованы с развивающим и воспитывающим компонентами цели. Не определена деятельность педагога в процессе самостоятельной работы учащихся в соответствии с обучающим компонентом, подведение итогов урока сведено к констатации хорошей работы учащихся на уроке;

- «два» бала – 8 конспектов (23,5%), низкий уровень, компоненты цели не согласованы с содержанием урока. Сравнительный анализ конспектов вышеназванных студентов показал, что и те, и другие имеют одинаковые просчёты в целеполагании, в разработке содержания урока.

Проанализировав результаты проведённого исследования, мы разработали и апробировали в учебном процессе вуза структуру целеполагания. Так, обучающий компонент цели определяют основные группы учебных задач. Это - композиция; форма, пропорции, конструкция; цвет; свет (освещение); пространство; объём. Развивающий компонент ориентирован на развитие познавательных, эмоциональных, оценочных, волевых, поведенческих, рефлексивных процессов. Воспитывающий компонент направлен на приобщение учащихся к духовным ценностям и приоритетам белорусского общества.

**Заключение.** Опыт показывает, что готовность специалиста к осуществлению учебно-воспитательной работы с учащимися обусловлена, прежде всего, состоянием специальной и методической подготовки на факультете, умением ставить и решать цели урока в практической педагогической деятельности.

Список литературы


1. Федьков, Г.С. Педагогическая практика в системе подготовки будущих учителей изобразительного искусства // Г.С. Федьков // Искусство и культура. – 2013. - № 3(11).
2. Горленко, В.П. Педагогическая практика студентов: развитие научных основ / В.П.Горленко; под ред. И.Ф. Харламова. – Минск: Университетское, 2002. – 294 с.


## САЦЫЯЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ДАСЛЕДАВАННЯ МАСТАЦТВА Ў ХХ СТАГОДДЗІ


*М.Л. Цыбульскі*

*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


У першай палове ХХ стагоддзя здаецца канчаткова была развянчана ілюзія незалежнасці мастацтва ад грамадства, і яшчэ больш узрасла неабходнасць вывучэння складаных міждысцыплінарных ўзаемадачыненняў тэорыі і гісторыі мастацтва з дапамогай розных метадаў тэарэтычнай і эмпірычнай сацыялогіі. Сацыялогія мастацтва ў шырокім сэнсе пачала даследаванне ўзаемазалежнасцяў паміж грамадствам ў цэлым і мастацтвам, як спецыфічнай сферай грамадскай дзейнасці. Аналізаваліся ўздзеянне мастацтва на аўдыторыю, сацыяльныя механізмы і сродкі распаўсюджвання твораў мастацтва, мастацкія густы публікі, іх дыферэнцыяцыя і ўплывы на мастацкую творчасць.

У ХХ стагодзі спецыфіка сацыялогіі мастацтва, як галіны сацыялагічных ведаў абумоўлена мноствам трактовак паняцця “мастацтва”. Так, ці інакш мастацтва, як сацыяльны фенамен ў мінулым стагоддзі аналізуецца па трох накірунках, сярод якіх: змястоўны аналіз твораў мастацтва з выкарыстаннем сацыялагічных метадаў, сацыялогія мастацкай вытворчасці і сацыялогія спажывання ў мастацкай сферы.

Мэта даследавання – вызначыць і прааналізаваць асноўныя сацыялагічныя аспекты даследавання мастацтва ў ХХ стагоддзі.

**Матэрыял і метады**. Матэрыялам даследавання сталі навуковыя працы і апублікаваныя ў XX стагоддзі матэрыялы замежных і айчынных аўтараў, звернутыя да шматлікіх сацыялагічных аспектаў аналіза мастацтва. Сярод асноўных метадаў, якія выкарыстаны у даследаванні – храналагічны і метад сістэмнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Ўжо ў XIX стагоддзі з'яўленне сацыялогіі мастацтва вызначыла два адносна самастойныя накірункі даследавання – тэарэтычную і эмпірычную (прыкладную) сацыялогію мастацтва. Кола праблем тэарэтычнай сацыялогіі мастацтва склалі выяўленне разнастайных формаў сацыяльнай абумоўленасці мастацтва, уплывы вядучых сацыяльных груп на тэндэнцыі мастацкай творчасці і крытэрыі мастацкасці, сістэма ўзаемаадносін мастацтва і ўлады. Даследаванні ж аўдыторыі мастацтва, стымулаў далучэння публікі да розных відаў мастацтваў, статыстычны і колькасны аналіз працэсаў мастацкай творчасці, ўспрымання – сталі прадметам даследавання эмпірычнай сацыялогіі мастацтва.

У пачатку XX стагоддзя на Захадзе назіраўся сапраўдны выбух цікавасці да сацыялагічнай праблематыкі мастацтва. Ля вытокаў сацыялогіі мастацтва ў гэты час стаяў Макс Вэбер, які ў сваіх працах звярнуўся да сацыялогіі музыкі і катэгорыі рацыянальнасці.

Але калі на Захадзе ў першай трэці XX стагоддзя ў сацыялагічнай трактоўцы мастацтва і яго гістарычнага развіцця пераважаў пазітывізм у формах сацыялагічнага рэдукцыянізму і інстытуцыяналізму, то ў Расіі, а пазней СССР – марксізм у формах эканамічнага і класавага дэтэрмінізму [**1**]. Прыкладна ў гэты час патрыярх амерыканскай сацыялогіі Люіс Мэмфард прапанаваў такую формулу сацыяльна-мастацкіх сувязяў: “калі грамадства здаровае - мастак узмацняе яго здароўе, калі грамадства хварэе - мастак узмацняе яго хваробу”. Пры гэтым Л. Мэмфард не ў поўнай меры ўлічваў крэатыўныя магчымасці самога мастака, яго магчымасці бачыць далей і глыбей сучаснікаў.

Калі на першым з'ездзе сацыёлагаў мастацтва ў 1930 г у Германіі былі прапанаваны нават дзве процілеглыя адна адной канцэпцыі сацыялогіі мастацтва, то.ў былым СССР у гэты ж час сацыялагічны падыход да даследавання мастацтва ідэолагі сталінізму абвясцілі “вульгарным”, а сацыялогію мастацтва – буржуазнай навукай. Адносіны да сацыялогіі мастацтва ў савецкім грамадазнаўстве змяніліся толькі ў другой палове 50-х гадоў. Была створана сацыялагічная асацыяцыя, з'явіліся першыя даследаванні ў якіх прыярытэтнае значэнне меў сацыялагічны аналіз мастацтва (Дзмітрый Казлоў, Анатоль Харчаў, Аляксандр Ягораў).

У сярэдзіне XX стагоддзя ў розных краінах назіраецца павышаная ўвага да праблем сацыялогіі мастацтва, узнікаюць навуковыя падраздзяленні, утвараюцца даследчыя інтстытуты, рэгулярна праводзяцца канферэнцыі выдаюцца часопісы. У асэнсаванне праблем сацыялогіі мастацтва ў 1950-1960-х гадах значны ўнёсак зрабілі Тэадор Адорно і так званая франкфурцкая школа. У гэты перыяд П’ер Франкастэль стварыў і ўзначаліў першую ў Францыі кафедру сацыялогіі мастацтва ў Практычнай школе вышэйшых даследаванняў у Парыжы. Яшчэ адзін французскі сацыёлаг Жан Дювіньё ў 1969 годзе у сваёй кнізе "Сацыялогія мастацтва" [2] звярнуў увагу на неабходнасць распрацоўкі паняццяў і глыбіннага даследавання сацыяльнага значэння мастацкай творчасці. Адзін з заснавальнікаў рускай і амерыканскай сацыялагічных школ Піцірым Сарокін піша ў гэтыя гады аб тым, што мастацтва цесна злучана са “звышсістэмай” грамадства і калі яна змяняецца, то ў такім жа кірунку змяняюцца і ўсе асноўныя формы мастацтва. Падрыхтаваная нямецкім і венгерскім сацыелагам Арнольдам Хаузэрам яшчэ ў 50-я гады кніга “Сацыяльная гісторыя мастацтва і літаратуры” ў пачатку 70-х перавыдаецца выключна як "Сацыялогія мастацтва" [3].

Адным з ініцыятараў правядзення сацыялагічных апытанняў у свеце мастацтва стаў французскі сацыёлаг і філосаф П'ер Бурдье, які сцвярджаў, што кажучы пра публіку варта ўлічваць, што яна сацыяльна дыферэнцыявана. Бурдье аналізаваў катэгорыю “густу”, стварыў тэорыю “поля”, паводле якой мы не можам зразумець твор мастацтва і яго значэнне без ведаў пра асаблівасці “поля” у якім ён быў выкананы [4].

Спроба пабудаваць сацыялогію мастацтва як эмпірычную дысцыпліну ў пачатку 1970-х уласціва. прафесару сацыялогіі мастацтва Кёльнскага універсітэту Альфонсу Зільберману. Паводле яго тэорыі сацыялогія мастацтва будуецца на эмпірычным назіранні, а мастацкі працэс даследуецца ў яго татальнасці, г.зн. як узаемадзеянне і ўзаемазалежнасць мастакоў, твораў мастацтва і публікі.



Рэпазіторый ВДУ

Развіццё савецкай сацыялогіі мастацтва ў другой палове 60-х – пачатку 70-х гадоў было накіравана на вызначэнне прадмета і межаў сацыялогіі мастацтва; на высвятленне стаўлення да савецкай сацыялогіі мастацтва 20-х гадоў; на распрацоўку метадалогіі і інтэрпрэтацыю дадзеных эмпірычных сацыялагічных даследаванняў мастацкіх з'яў. І, канешне ж, на крытыку буржуазных канцэпцый сацыялогіі мастацтва (працы Айгара Вахеметса, Сяргея Плотнікава, Юрыя Пярова, Юрыя Давыдава, Міхаіла Аўсянікава, і інш).

У Еўропе і ЗША ў 70-х гадах XX стагоддзя паўстаў новы кірунак у нечым блізкі тэарэтычнай сацыялогіі мастацтва – "сацыяльная філасофія мастацтва", а. амерыканскі тэарэтык Джордж Дзікі ўпершыню акрэсліў контуры "істытуцыянальнай тэорыі мастацтва". Эпоха постмадэрнізму прадэманстравала новыя складаныя формы міждысцыплінарных узаемадзеянняў тэорыі і гісторыі мастацтва з рознымі метадамі тэарэтычнай і эмпірычнай сацыялогіі. Значна узрастае колькасць артыкулаў у якіх розныя аспекты сацыялогіі мастацтва былі прадстаўлены. Большасць з іх прысвечана інтэрпрэтацыі дадзеных пэўных сацыялагічных даследаванняў, вызначэнню сацыялагічнага кантэксту развіцця мастацтва. Больш рэдка разглядаюцца тэарэтычныя і метадалагічныя праблемы сацыялогіі мастацтва, пытанні статуса і прадмета сацыялогіі мастацтва

Адметная роля ў развіцці сацыялогіі мастацтва ў XX стагоддзі належыць прадстаўніку Чыкагскай сацыялагічнай школы Говарду Бекеру які лічыў, што аб'ект мастацтва нараджаецца не толькі зыходзячы з творчай працы яго аўтара, а і ў выніку функцыянавання так званага свету мастацтва, унутраныя сувязі якога ён і прапанаваў даследаваць [5].

У СССР у канцы 70-х пачатку 80-х гадоў праблема прадмета сацыялогіі мастацтва актыўна абмяркоўвалася ў працах А. Кукліна, С. Плотнікава, А. Карагіна, І. Леўшынай, А. Казіна, А. Сохара, Ю. Пярова і іншых.

У сярэдзіне 1980-х у Марсэлі адбылася Першая Міжнародная канферэнцыя сацыёлагаў мастацтва, якая пацвердзіла значны прагрэс у галіне сацыялогіі мастацтва за апошнія 25 гадоў, і адзначыла, што у межах сучаснай сацыялогіі актыўна вывучаюцца супярэчнасці паміж, па сутнасці, бязмежнымі магчымасцямі мастацтва і спосабамі іх сацыяльнай адаптацыі; даследуюцца формы ангажаванага стаўлення да мастацтва з боку палітыкі.

Сацыялогія мастацтва ў 1990-я гады перажывала новы ўзлёт як ў ЗША, так і ў Еўропе, дзе актыўна разгортваліся сацыялагічныя даследаванні, быў арганізаваны сталы маніторынг наведвальнікаў музеяў, аналіз іх сацыяльна-дэмаграфічных характарыстак, і да т.п.. Асноўнай мэтай даследаванняў было атрыманне канкрэтных дадзеных, неабходных для выпрацоўкі пэўнай культурнай палітыкі як асобных інстытутаў, так і дзяржавы ў цэлым. Навуковыя даследаванні (Веры Зольберг, Вэндзі Грысвальда, Дж. Харысана і Сінцыі Уайт і інш.) таксама былі скіраваны на працэсы стварэння твораў мастацтва. Напрыканцы XX стагоддзя сацыялогію мастацтва пачалі атаясамляць з сацыялогіяй культуры. У праблемным полі сацыялогіі, аказаліся пытанні ўздзеяння мастацтва на аўдыторыю, сацыяльныя механізмы і сродкі распаўсюджвання твораў мастацтва, мастацкі густ публікі, яго дыферэнцыяцыя, яго ўздзеянне на мастацкую прадукцыю.

**Заключэнне**. XX стагоддзе стала важным этапам фарміравання асобных галін сацыялогіі мастацтва: сацыялогіі музыкі, тэатра, жывапісу, кіно і тэлебачання Развіццё заходняй сацыялогіі мастацтва ў мінулым стагоддзі. засноўвалася на розных тэарэтычных і метадалагічных падыходах, напрыклад такіх, як інтэракцыянізм, функцыяналізм, тэорыя культурна-гістарычных тыпаў, тэорыя сацыяльнага дзеяння і г.д.. Кола нявырашаных праблем, да якіх звярталіся даследчыкі, было злучана з вызначэннем ролі, якую мастацтва адыгрывае ў жыцці чалавека, у развіцці грамадства. На сацыялогію мастацтва не мог не паўплываць і той факт, што ў сучасным мастацтве, эстэтыцы многія катэгорыі моцна змяніліся, набылі цэлы шэраг дадатковых канатацый. .А сучаснае мастацтвазнаўства ўсё больш часу прысвячае высвятленню пытання пра межы самога мастацтва.

Спіс літаратуры


1. Глотов М.Б. Границы предмета социологии искусства // Социологические исследования, 1999. – №. 1. – С. 122.
2. Duvignaud J. Sociologie de l`art. Paris, 1969.
3. Hauser A. Soziologie der Kunst. Munchen, 1974.
4. Бурдье П. Социология социального пространства. – М. – СПб., 2007.
5. Becker H.S. Art Worlds. Berkley, 1982.
6. Хренов Н.А. Социально-психологический аспект взаимодействия искусства и публики. – М., 1981.


Репозиторий ВГУ